ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
03 студзеня 2023 г.

ІНСТРУКЦЫЯ аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю дзіцячай эстраднай творчасці “Масты надзей”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю дзіцячай эстраднай творчасці “Масты надзей” (далей - Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца: пошук і рэалізацыя мастацкага патэнцыялу таленавітых дзяцей і падлеткаў; выяўленне і падтрымка таленавітых выканаўцаў; фарміраванне эстэтычнага густу маладога пакалення на лепшых узорах нацыянальнай культурнай спадчыны і сучаснага мастацтва; арганізацыя вольнага часу дзяцей і моладзі, прыцягненне да ўдзелу ў фестывалях і конкурсах юных талентаў; фарміраванне “банка дадзеных” таленавітай моладзі.

3. Арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, сектар культуры Мастоўскага райвыканкама.

4. Пры арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні Фестывалю арганізатары і ўдзельнікі кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўднай Інструкцыяй.

5. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю ажыццяўляецца арганізацыйным камітэтам (далей – аргкамітэт), склад якога зацвярджаецца дадаткова (Дадатак 1).

6. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама аб пераносе даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

7. У Фестывалі прымаюць удзел лепшыя эстрадныя калектывы (вакальныя, сучаснай харэаграфіі), асобныя выканаўцы і дуэты (вакал), вядучыя ва ўзросце ад 6 да 17 гадоў.

8. Калектывы са званнем “Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь” удзельнічаюць па-за конкурснай праграмы Фестывалю.

9. Фестываль праводзіцца 1 раз у 2 гады.

10. Канкурсанты рыхтуюць да выканання:
вакальныя ансамблі і салісты – 1 песня (пад фанаграму “-1”, да 4 хвілін);
харэаграфічныя калектывы – 1 нумар (да 4 хвілін);
вядучыя – прэзентацыя (да 1 хвіліны) і вядзенне фрагмента конкурснай праграмы фестывалю.

11. Выступленні канкурсантаў ацэньваюцца па наступных крытэрыях:
чысціня і выразнасць выканання; сцэнічная культура; адпаведнасць рэпертуару ўзросту выканаўцы; якасць аранжыроўкі і фанаграмы; мастацкае афармленне эстраднага нумару (касцюм, свет, рэжысура); артыстызм, арыгінальнасць выканання.

12. Па выніках Фестывалю журы (Дадатак 2) вызначае ўладальніка Гран-пры фестывалю дзіцячай эстраднай творчасці "Масты надзей".

13. Журы, таксама вызначае лаўрэата I, II, III ступені ў наступных намінацыях:

саліст-вакаліст (дуэт);
вакальны ансамбль (да 10 чалавек);
вядучы;
ансамбль эстраднага танца.

14. У кожнай намінацыі вылучаюцца пераможцы ў трох узроставых катэгорыях:

малодшая (ад 6 да 9 гадоў)*;
сярэдняя (ад 10 да 13 гадоў)*;
старэйшая (ад 14 да 17 гадоў)*.

15. Дадаткова журы ўзнагароджвае ўдзельнікаў спецыяльнымі дыпломамі ў рамках і прызамі:

за ўдалы дэбют;
за лепшае рэжысёрскае вырашэнне нумару;
за лепшы сцэнічны касцюм;
за ўдалае спалучэнне ў нумары некалькіх жанраў мастацтва;
за лепшы аўтарскі твор;
за лепшае выкананне твора беларускіх аўтараў;
прыз глядацкіх сімпатый.

16. Астатнія ўдзельнікі ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у Фестывалі.

17. У 2023 годзе Фестываль адбудзецца 20 мая ў г. Масты.

18. Для ўдзелу ў Фестывалі неабходна аформіць агульны спіс калектываў-удзельнікаў, салістаў і вядучых ад раёна (г. Гродна), заяўкі (дадатак 3) на кожны калектыў, саліста і вядучага асобна, зацверджаныя начальнікам аддзела (сектара) культуры гаррайвыканкама, і даслаць іх да 1 мая 2023 года па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ", "Масты надзей"; кантактныя тэлефоны: +375152623799; тэл./факс: +375152623787, e-mail: info@gromc.by

19. Агульная колькасць нумароў (заявак) ад кожнага раёна па ўсіх намінацыях не павінна перавышаць 3, ад г. Гродна – 12, ад Мастоўскага раёна – 6, ад Лідскага – 6.

20. Журы пакідае за сабой права пры адсутнасці конкурсу ў адной з намінацый альбо катэгорый аб'ядноўваць іх альбо ўводзіць дадатковыя

[*] на дату правядзення фестывалю

наміінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду Фестывалю, падзяляць лаўрэацкія месцы і вызначаць дадатковыя спецыяльныя прызы, не прысуджаць званні лаўрэатаў.

21. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

22. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

23. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, спецыяльныя прызы, дыпломы, рамкі для дыпломаў.

24. Для фінансавання Фестывалю на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

25. Пераможцы ў намінацыі "вядучы" будуць рэкамендаваны для вядзення абласных і рэспубліканскіх святочных мерапрыемстваў.

26. Лаўрэаты фестывалю ў намінацыі "саліст-вакаліст (дуэт)", "вакальны ансамбль" і "ансамбль эстраднага танца" ўключаюцца ў спіс кандыдатаў да ўдзелу ў творчых мерапрыемствах і абласных канцэртах.

27. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс выступленняў калектываў і іх распаўсюджванне рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю
дзіцячай эстраднай творчасці
"Масты надзей"

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Давыдзік М.В. | намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама, сустаршыня аргкамітэта; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Палуйчык А.В. | загадчык сектара культуры Мастоўскага райвыканкама, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Басякова Ю.А. | выкладчык УА "Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў"; |
| Варабей А.А. | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама; |
| Кузьміцкі С.П. | намеснік дырэктара ДУ "Мастоўскі раённы цэнтр культуры"; |
| Пекар А.Ю. | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Чапялюк А.А. | галоўны рэжысер ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю
дзіцячай эстраднай творчасці
“Масты надзей”

СКЛАД ЖУРЫ

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы;* |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні журы;* |
| Басякова Ю.А. | выкладчык УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”; |
| Варабей А.А. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Кузьміцкі С.П. | намеснік дырэктара ДУ “Мастоўскі раённы цэнтр культуры”; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Чапялюк А.А. | галоўны рэжысер ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю дзіцячай эстраднай творчасці
“Масты надзей

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела (сектара) культуры
гар(рай)выканкама

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі
райвыканкама

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным фестывалі дзіцячай эстраднай творчасці
“Масты надзей” *

1. Намінацыя________________________________________________
2. Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка ці назва калектыву_______________________________________________________
3. Колькасць удзельнікаў нумару _______________________________
4. База дзейнасці_____________________________________________
5. Дата нараджэння, узроставая катэгорыя________________________
6. Кантактны тэлефон ________________________________________
7. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка (без скарачэнняў), тэлефон (мабільны)_____________________________________________________
8. Назва конкурснага твора (харэаграфічнай кампазіцыі) _______________________________________________________
9. Аўтары вакальнага твору (абавязкова да запаўнення, пісаць без скарачэнняў прозвішча, імя, імя па бацьку) ___________________________________________________________
10. Хранаметраж____________________________________________
11. Гукавы носьбіт____________________________________________
12. Тэхнічны райдэр___________________________________________
13. Відэафрагмент нумароў, якія будуць прадстаўлены на фестывалі_____________________________________________
14. Прадставіць відэафрагмент нумару ўдзельніка (30-60 сек.) _________
15. Кароткая творчая характарыстыка (да 50 слоў: цікавая інфармацыя пра калектыў, удзельніка, рэпертуар, а не толькі пра ўдзел у розных конкурсах і фестывалях)_______________________________________

Кіраўнік базавай установы_________________________________________
(подпіс з расшыфроўкай)

*** Заяўка дасылаецца ў фармаце word і pdf**

*Заяўкі для ўдзелу ў фестывалі дасылаюцца да 27 красавіка 2023 года па адрасе: г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, e-mail: info@gromc.by*